# АСАБЛІВАСЦІ СЕМАНТЫКІ І ФУНКЦЫЯНАВАННЯ АД'ЕКТЫЎНЫХ КАМПАРАТЫВАЎ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

П. Л. Салаўёў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

У цэнтры нашай увагі знаходзяцца ад'ектыўныя кампаратывы (АК) – вобразныя параўнальныя канструкцыі са структурай *Adj як N*. У працах, прысвечаных параўнанню, не раз гаварылася аб асаблівай складанасці АК як аб'екта семантычнага даследавання і лексікаграфічнага апісання (гл., напрыклад, [1, с. 140; 3, с. 9]).

Асноўныя разыходжанні паміж даследчыкамі тычацца пытанняў наяўнасці/адсутнасці семантычнай тоеснасці паміж ад'ектыўнымі кампаратывамі і словазлучэннямі тыпу *вельмі* + *Adj*. Так, А. Вяжбіцка заўважае, што *худы, як трэска* – "гэта нешта якасна адрознае ад банальнага *вельмі худы*" і прапаноўвае наступнае ўніверсальнае семантычнае тлумачэнне АК: 'X худы; нішто не магло б быць больш худым, сапраўды, гэта магла б быць толькі трэска' [1, с. 140]. Тым не менш, прапанаваная інтэрпрэтацыя відавочна падкрэслівае суперлятыўны характар АК як моўнай адзінкі, якая выказвае гранічна высокую ступень праявы прыкметы 'худы'.

Безумоўна, нельга не пагадзіцца з тым, што прыкмета, актуалізаваная пры дапамозе АК, успрымаецца як больш інтэнсіўная ў параўнанні з прыкметай, названай пры дапамозе адзінкавага прыметніка (*пар. худы – худы, як запалка; худы, як іголка; худы, як дошка і г. д.*). Гэты эфект ствараецца дзякуючы экспрэсіўнасці кампаратыўнай канструкцыі, якая, у сваю чаргу, фарміруецца за кошт неадпаведнасці кампаранта (аб'екта, які параўноўваецца) пэўнаму стандарту, норме. Такім чынам, ва ўніверсальным семантычным тлумачэнні АК акцэнт павінен быць зроблены на анамальнай, нестандартнай для дадзенай культурна-моўнай супольнасці праяве прыкметы. Сэнсавая інтэрпрэтацыя АК у такім выпадку можа выглядаць наступным чынам: 'X худы; худзізна X стварае такое самае ўражанне, каб нібы гэта быў Y'. Дадзенае тлумачэнне ў поўнай меры адлюстроўвае двaістую моўную функцыю АК: выражэнне ведаў аб якасці/ўласцівасці X і адначасова суб'ектыўнае ўспрыманне прамоўцам дадзенай якасці/ўласцівасці.

З пазначанай праблемай моўнай функцыі і сэнсавай інтэрпрэтацыі АК цесна звязана пытанне аб парадыгматычных адносінах параўнальных канструкцый з агульнай прыкметай-асновай, такіх як, напрыклад, *высокі, як вежа; высокі, як слуп; высокі, як баскетбаліст*. У выпадку прызнання семантычнай тоеснасці паміж кампаратывамі і сінтаксічнымі канструкцыямі *вельмі* + *Adj* такія АК таксама патрэбна было б лічыць семантычна тоеснымі адзін аднаму, а адносіны паміж імі кваліфікаваць як адносіны абсалютнай сінанімії.

Большасць даследчыкаў усё ж схільныя разглядаць АК з агульнай асновай як сінанімічныя, але не тоесныя. Як слушна заўважыў У. М. Макіенка, у дадзеным выпадку мы сутыкаемся з уяўнай тоеснасцю [3, с. 8]. Выбар аб'екта параўнання (кампарата) у кожным пэўным выпадку залежыць ад мноства фактараў, у ліку якіх індывідуальны, сацыяльны або нацыянальны досвед [2, с. 56]. Мноства лексем, што ўжываюцца ў якасці кампаратаў, іх тэматычная і семантычная разнароднасць, розны экспрэсіўны патэнцыял, у сваю чаргу, вызначаюць розную ступень "эмацыйнай напружанасці" [4, с. 142] і дазваляюць выказаць меркаванне пра наяўнасць рознай ступені суб'ектыўна-моўнага ўзмацнення прыкметы-асновы ў сінанімічных АК.

Для пацверджання дадзенай здагадкі намі быў праведзены псіхалінгвістычны эксперымент, дзе ўдзельнікам было прапанавана вызначыць інтэнсіўнасць прыкметы ў сінанімічных АК, што выкарыстоўваюцца для апісання знешнасці і целаскладу чалавека і што фарміруюць ядро кампаратыўна-асацыятыўных палёў (КАП) "Прыгажосць", "Таўшчыня цела", "Рост". Пры гэтым выніковай мэтай ставілася не выяўленне ступені інтэнсіўнасці прыкметы для кожнай кампаратыўнай адзінкі і перавод яе ў колькаснае вымярэнне, а 1) усталяванне магчымасці градуіравання прыкметы, што выражаецца пры дапамозе АК; 2) выяўленне механізмаў і заканамернасцей семантычнай градацыі прыкмет, што выражаюцца пры дапамозе АК.

Эксперымент праводзіўся сярод студэнтаў факультэта журналістыкі БДУ ў 2005 г. і быў паўтораны ў 2010 г. з мэтай пацверджання невыпадковасці атрыманых дадзеных. Безумоўна, пры правядзенні паўторнага эксперыменту вызначаныя колькасныя несупадзенні з'яўляюцца прадказальнымі і заканамернымі, што абумоўлена спецыфікай прадмета даследавання: інтэнсіўнасць прыкметы, як і любая з'ява, якая адносіцца да ўнутранага, семантычнага боку мовы, не паддаецца дакладнаму вымярэнню. Для нашага даследавання важны той факт, што пры некаторых прыватных колькасных несупадзеннях графічна прадстаўлены профіль інтэнсіўнасці прыкметы, што выражаецца праз АК, у цэлым застаецца нязменным. Гэта дае падставу гаварыць аб наяўнасці градацыі ў залежнасці ад інтэнсіўнасці названай прыкметы ў рамках згаданых КАП.

Аналіз атрыманага эксперыментальным шляхам моўнага матэрыялу дазволіў выявіць шэраг фактараў, якія аказваюць уплыў на ступень моўнай інтэнсіўнасці прыкметы. Так, для АК, што заснаваны на параметрычнай характарыстыцы (*тоўсты, высокі*), інтэнсіфікатарам выступае дадатковая параметрычная сема 'вялікі' ў дэнататыўным значэнні кампарата: слон - 'тоўсты' + 'вялікі', гара - 'высокая' + 'вялікая'. Дадзены семантычны элемент можа і не быць замацаваны лексікаграфічна, аднак інтуітыўна вызначаецца носьбітамі мовы: усе АК у КАП "тоўсты" і "высокі", што маюць

параметрычную сему 'вялікі', былі аднесеныя інфармантамі да вышэйшага градацыйнага ўзроўню.

Падобная сітуацыя назіраецца і ў КАП "худы" і "невысокі / маленькі", аднак у якасці інтэнсіфікатара тут выступае семантычны кампанент 'маленькі', прысутны ў семантычнай структуры кампарата. Пар. *худы, як запалка*: *запалка* – 'тонкі' + 'маленькі (па памеры)'.

Значна менш агульнага дэманструюць АК са згаданымі прыкметамі-асновамі, што аднесены па выніках эксперыменту да ніжняга, найболей набліжанага да нормы ўзроўню градацыйнай шкалы. Гэта, відавочна, абумоўлена рознымі ўяўленнямі аб норме чалавечага росту і таўшчыні цела. Так, па меркаванні інфармантаў, найменш інтэнсіўнай з'яўляецца прыкмета "тоўсты", што выражаецца пры дапамозе АК *тоўсты, як булка / гарбуз / мяч*. Відавочна, прыцягненне да параўнання аб'ектаў "булка", "гарбуз", "мяч" не фарміруе ў носьбітаў мовы вобраза, які празмерна перавышае стандартнае ўяўленне аб "тоўстым чалавеку", а звязана з іншымі праявамі дадзенай прыкметы, у прыватнасці, незвычайнасцю формы.

Што датычыцца КАП "высокі" – "невысокі", то ў дадзеным выпадку найбольш блізкімі да нормы з'яўляюцца АК з кампаратамі – найменнямі чалавека: *высокі, як баскетбаліст; маленькі, як пігмей.*

АК з кампаратамі – найменнямі чалавека размясціліся на ніжнім градацыйным узроўні і ў КАП "прыгожы". У цэлым, арганізацыю дадзенага КАП з пункта гледжання градацыйных асаблівасцей можна ахарактарызаваць наступным чынам: інтэнсіўнасць прыкметы "прыгожы" зваротна прапарцыйная матэрыяльнасці дэнатата, што вызначаецца лексемай-кампаратам. Адпаведна, найбольшай інтэнсіўнасці прыкмета "прыгожы" дасягае ў АК *прыгожы, як Бог / Апалон / анёл*, найменшай - у АК, дзе ў якасці аб'ектаў-кампаратаў выступаюць прадметы матэрыяльнага свету (*як малюнак*) і найменні чалавека (*як кінаакцёр*). Адзначым, што залежнасць інтэнсіўнасці прыкметы-асновы ад матэрыяльнай выяўленасці суадноснага з кампаратам дэнатата характэрная і для КАП "непрыгожы".

Такім чынам, КАП, заснаваныя на антанімічных прыкметах, выяўляюць у той або іншай ступені сіметрычную арганізацыю з пункту гледжання градацыйных асаблівасцей, паколькі парныя прыкметы (тоўсты – худы, высокі – невысокі, прыгожы – непрыгожы) маюць падобныя сродкі і механізмы інтэнсіфікацыі.

1. Вежбицкая, А. Сравнение – градация – метафора / А. Вежбицкая // Теория метафоры : сборник / общ. ред. Н. Д. Арутюновой, М. А. Журинской. – М. : Прогресс, 1990. – С. 133 – 152.

2. Конюшкевич, М. И. Компаративно-ассоциативное поле как единица сопоставительного анализа / М. И. Конюшкевич // Антропоцентричний підхід у дослідженні мови : матер. VII міжнар. Карскіх читань 13 - 14 травня 1998 р. – Ніжин – Гродна – Ніжин : «ТОВ Наука-Сервіс», 1998. – С. 55 − 59.

3. Мокиенко, В. М. Словарь сравнений русского языка : 11000 единиц / В. М. Мокиенко. – Санкт-Петербург : Норинт, 2003. – 608 с.
4. Огольцев, В. М. Устойчивые сравнения в системе русской фразеологии / В. М. Огольцев. – Л. : Изд-во Ленинградского университета, 1978. – 159 с.